*А.В.Пагоцкая*

# ШКОЛЬНЫЯ ТЭАТРЫ НА БЕЛАРУСІ
# ( канец XVI–XVIII ст.)

У XVI ст. паўсюдна пачынаюць адкрывацца школы і калегіі для падрыхтоўкі служыцеляў царквы. Месцазнаходжанне і функцыянаванне школьнай сцэны звязана з манастырамі ў каралеўскіх і прыватнаўласніцкіх гарадах і мястэчках, куды рэгулярна з'язджалася шляхта на сеймы, кірмашы, суды, рэлігійныя святы. Такое размяшчэнне тэатраў адпавядала імкненню рэлігійных школ паказваць свае спектаклі больш шырокаму колу шляхты (выхадцы з яе вучыліся ў гэтых навучальных установах).

Школьныя тэатры існавалі пры духоўных навучальных установах: у акадэміях, калегіумах, брацкіх школах. У XV–XVIII стст. яны былі пашыраны ў Польшчы, адкуль і прыйшлі на Беларусь.

У сваіх вытоках школьны тэатр быў звязаны, з аднаго боку, з народнымі ігрышчамі, маскараднымі пераапраннямі, пацехамі скамарохаў, з фальклорнай драмай, з другога – з імкненнем царквы надаць тэатралізаваны характар рэлігійнаму абраду, падаць яго ў жывым дзеянні, інсцэнізаваць найбольш драматычныя эпізоды Бібліі. Школьны тэатр спалучаў містэрыяльныя традыцыі, вопыт антычных драматургаў (асабліва Плаўта і Тэрэнцыя) са здабыткамі свецкай драматургіі эпохі Адраджэння.

На Беларусі ў XVII–XVIII стст. у будынках кляштараў, калегій, школ існавалі для паказаў спецыяльныя тэатральныя залы са сталай сцэнай, абсталяванай рознымі механізмамі, у тым ліку люкамі, апафеозамі, або глорыямі (прыстасаванне пад столлю над сцэнай для спуску з "нябёс" багоў, анёлаў) і інш.

Найбольшае распаўсюджанне школьны тэатр у XVI–XVIII стст. атрымлівае ў езуіцкіх калегіях. У сваіх навучальных установах езуіты ўводзяць у практыку вучэбныя пастаноўкі: у калегіях і школах Нясвіжа, Бабруйска, Віцебска, Гродна, Навагрудка, Оршы, Слуцка да паказу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спектакляў прыстасоўваюцца рэкрэацыйныя залы, а ў Брэсцкай калегіі і Полацкай акадэміі ў XVIII ст. узводзяць спецыяльныя тэатральныя памяшканні, абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі. Вядома, не ўсе тэатры валодалі вялікімі магчымасцямі. Часам спектаклі ставіліся ў школьных залах без спецыяльнага афармлення. Калі хацелі сабраць большую колькасць гледачоў, пастаноўкі выносілі за межы школы, у касцёл, на плошчы. У гарадах пад адкрытым небам наладжваліся рэлігійныя тэатралізаваныя шэсці, шматдзённыя містэрыі, маралітэ, якія атрымалі назву “дыялогі”.

На школьнай сцэне з’явіліся і трагедыі, блізкія да класіцысцкай свецкай трагедыі, і камедыі, цесна звязаныя з народным тэатрам, з камедыяй дэль артэ. У школьны рэпертуар уваходзіла і свецкая класіка. На вучнёўскіх сцэнах ставілі “Сіда” і “Атона” П.Карнеля, “Гафолію” Ж.Расіна, “Заіру” і “Альзіру” Вальтэра.

Школьныя драматургі ўвялі ў польска-беларускую культуру тэорыю тэатральнага мастацтва. Пра тэатр, яго канструкцыю і задачы пісалі М.К.Сарбеўскі, Ф.Ланг і іншыя аўтары школьных паэтык. У сваіх сачыненнях яны папулярызавалі антычныя тэорыі і сучасныя дасягненні заходнееўрапейскага тэатра.

Самым старым тэатральным горадам Беларусі лічыцца Вільня. Ужо з 1569 г. там існаваў школьны тэатр пры езуіцкім калегіуме [3, с. 209]. Тэатр быў заснаваны ў 1585 г. у Полацкім езуіцкім калегіуме [2, с. 159], а першым спектаклем у ім стала трагедыя “Навуходаносар”. Акрамя таго, полацкая калегія мела спецыяльную бурсу для музыкантаў і свой аркестр. Тэатральных збудаванняў у гэтых навучальных установах не было. Таму для паказаў даводзілася прыстасоўваць навучальныя класы і залы.

Гродзенскі школьны тэатр існаваў у XVII–XVIII стст. Паводле звестак В.Дадзіёмавай, першы спектакль адбыўся ў 1635 г. Ставіліся “дыялогі”, масленічныя драмы, урыўкі са Святога Пісання – у касцюмах і на фоне дэкарацый, з разнастайным рэквізітам (келіх для віна з чэрапа, крыштальная ваза, атручаны яблык) [1, с. 133–135].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Брэсцкі школьны тэатр дзейнічаў у 1615–1697 гг. пры езуіцкім калегіуме ў Брэсце. Паводле польскага даследчыка Л.Сімана, пастаноўкі адбываліся і пазней – у 1696–1760 гг. [3, с. 179].

У першай трэці XVIII ст. школьныя тэатры існавалі не толькі ў гарадах, але і ў мястэчках. Так, вядомы праграмы трох драм, пастаўленых у Жодзішках, што каля Смаргоні (1716–1730) [1, с. 138].

З 1692 г. па 1729 г. існаваў школьны тэатр у Мсціславе. Яго прадстаўленні адбываліся ў школьным будынку, дзе была вялікая зала для публічных выступленняў [1, с. 138–139].

Школьныя тэатры пры езуіцкіх калегіях існавалі таксама ў Нясвіжы (1586–1758), Пінску (1614–1764), Оршы (1610–1703), Навагрудку (1624–1761), Мсціславе (1630–1772), Віцебску (1671–1766), Магілёве (1680 – першая палова XVIII ст.), Слуцку (1696–1756), Бабруйску (1723–1768), Слоніме (1744–1769).

У XVII–XVIII стст. езуіты ведалі ўсёй сістэмай адукацыі ў Мінску. Вядома, што з 1682 г. яны выкладалі ў школах рыторыку, паэзію, сінтаксіс і граматыку. Захаваліся звесткі аб існаванні тэатра пры калегіуме адной са школ. Першыя прадстаўленні на гэтай сцэне адносяцца да 1698 г.: тады былі пастаўлены “дыялогі” на заканчэнне вучэбнага года. Публічныя выступленні школьнага тэатра пачынаюцца з 1690 г.

Школа калегіі езуітаў з’яўляецца найбольш старажытным збудаваннем, звязаным з гісторыяй тэатра ў Мінску (цяпер перабудаванае памяшканне музычнай школы, плошча Свабоды, 7), дзе ў XVII–XVIII стст. (1689–1727) праходзілі пастаноўкі школьнай драмы.

Акрамя езуітаў, паказы школьнага тэатра наладжвалі і пратэстанты ў Слуцку (зафіксаваны ў 1686 г.). У другой палове XVIII ст. дзейнічалі школьныя тэатры піяраў у Віцебску (вядомы паказы ў 1765–1771 гг.) і Лідзе (1771–1772).

З сярэдзіны XVIII ст. школьныя тэатры арганізоўвалі уніяцкія і праваслаўныя навучальныя ўстановы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Базыльянскія школьныя тэатры існавалі ў Жыровічах (вядомы паказы ў 1752 г.) і Навагрудку (1760-я гг).

Выключнай і унікальная з'явай стаў Забельскі школьны тэатр. Гэта быў адзіны ў Беларусі школьны тэатр ордэна дамініканцаў у 1787–1791 гг. і апошні школьны тэатр. Амаль усе творы, якія ўзніклі ў забельскім асяроддзі, з'яўляюцца асветніцкімі па гучанні і класіцысцкімі па стылі.

Многія школьныя спектаклі ў XVIII ст. ставіліся ў пастаянных памяшканнях магнацкіх тэатраў (напрыклад, у Нясвіжы, Слуцку).

Школьны тэатр, які атрымаў распаўсюджанне ў Беларусі і Літве яшчэ падчас праўлення Сігізмунда III, у XVIII ст. працягваў існаванне. У яго рэпертуар уваходзілі гэтак званыя "працэсіі" і "дыялогі", а ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., калі характар прадстаўленняў наблізіўся па манеры да тэатраў свецкіх, прафесійных, то і оперы. Можна меркаваць, што шэраг мастацкіх прыёмаў, прынятых на школьнай сцэне, засвойваўся прыватнаўласніцкім прыгонным тэатрам Беларусі XVIII ст., з якім школьны тэатр існаваў адначасова. Тэндэнцыі позняга барока (1740–1760-я гг.) выявіліся ў дзейнасці маёнткавых прыватнаўласніцкіх тэатраў, яны ж адначасова і паклалі пачатак тэатральнаму мастацтву Асветніцтва.

Тэатральная архітэктура і дэкарацыйнае мастацтва беларускіх школьных тэатраў названага перыяду пераймалі мастацкую практыку заходнееўрапейскага тэатра, за навінкамі якога ўважліва сачылі выкладчыкі езуіцкіх калегій. Беларусь знаходзілася на мяжы дзвюх культур – рымска-каталіцкай і візантыйска-праваслаўнай, таму магла ўспрымаць і пераасэнсоўваць іх лепшыя дасягненні.

---

1. *Гісторыя* беларускага тэатра: у 3 т. / АН БССР, ІМЭіФ. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – Т. 1: Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. – 496 с.

2. *Орлов, В.* Alma mater Polocensis: к 180-летию Полоцкой академии / В.Орлов // Неман. – 1993. – № 4. – С. 156–169.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Тэатральная* Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2002. – Т. 1. – 568 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ